Багданович, А. Б. Крыніцазнаўчыя аспекты вывучэння этнічнай ідэнтычнасці беларусаў у сярэднявякоўі / А. Б. Багдановіч // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. Вып. 2/ Рэдкал.: С. М. Ходзін (адказ. рэд.) і інш. – Мн.: БДУ, 2005. – С. 145–148.

**А. Б. Багдановіч**

# Крыніцазнаўчыя аспекты вывучэння этнічнай ідэнтычнасці беларусаў у сярэднявякоўі

Даследаванне этнічнай ідэнтычнасці сярэдневяковага беларускага насельніцтва немагчыма без вывучэння вялікай колькасці гістарычных крыніц. У летапісных зводах утрымліваюцца важныя звесткі аб рассяленні ўсходнеславянскіх плямёнаў, а таксама іх суседзяў. У сувязі з гэтым летапісныя спісы працягваюць заставацца асноўнай крыніцай па гісторыі Старажытнай Беларусі. У той жа час у іх вельмі кепска адлюстраваны пачатковы перыяд гісторыі ўсходніх славян: летапісцы абмяжоўваюцца толькі агульнымі заўвагамі і апісаннямі. Варта ўлічваць і той немалаважны факт, што летапісныя зводы дайшлі да нас у позніх спісах, неаднаразова перапісваліся, рэдагаваліся, у сувязі з чым у тэкстах сустракаецца шмат вымыслаў, ідэй, якія адлюстроўваюць пэўныя палітычныя інтарэсы.

Летапісная традыцыя была працягнута і ў Вялікам княстве Літоўскім. У беларуска-літоўскіх летапісах XIV—XVI ст. прасочваецца вербальнае адлюстраванне палітычных інтарэсаў феадальных груповак ВКЛ, у той жа час у летапісах ёсць важныя звесткі аб культурных і этнаканфесійных працесах, што адбываліся на землях Беларусі. Большасць гэтых помнікаў апублікавана.

Погляды на класіфікацыю беларуска-літоўскіх летапісаў зведалі значную эвалюцыю. На сучасным этапе комлекс дадзеных крыніц падзяляецца на чатыры групы:

«Летапісец вялікіх князёў літоўскіх», які складаецца з наступных помнікаў: «Origo regis», Віленскі, Дуброўскі;

Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.: Нікіфароўскі, Акадэмічны, Супрасльскі спісы;



«Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага»: Красінскі, Патрыяршы А, Альшэўскі, Археалагічнага таварыства, Румянцаўскі, Патрыяршы Б, Ціханравава, Пазнанскі і Яўрэінаўскі;

«Хроніка Быхаўца».

Кожная з гэтых груп спісаў мае ў сваёй аснове самастойны помнік, што дадаткова пацвярджаецца наяўнасцю ў іх асабістых рэдакцый. Выключэнне складае «Хроніка Быхаўца», вядомая ў адным спісе.

Больш позняя Баркулабаўская, якая завяршае летапісную традыцыю XII—XVI ст., не з'яўляецца летапісам у пэўным сэнсе. Увага яго аўтара сканцэнтравана галоўным чынам на сяле Баркулабава, а таксама здарэннях, якія адбываліся на Магілёўшчыне, Віцебшчыне і ў некаторых іншых раёнах Усходняй Беларусі. Сведкам адрознення гэтай крыніцы ад папярэдніх летапісаў з'яўляецца і багацце бытавых дэталяў.

Асобны тып крыніц, якія валодаюць спецыфічнымі рысамі, прадстаўляюць дакументы заканадаўства. Найбольш ранні з іх — «Праўда Руская» — першы сістэматызаваны зборнік заканадаўчых нормаў рускіх зямель X—XII ст., што дайшоў да нас. Яна заснавана на асобных княжацкіх судовых пастановах («Праўда Яраслава», «Устаў Уладзіміра Манамаха»). Да гэтага ж тыпу крыніц варта аднесці граматы і дамовы Полацка, Віцебска і Смаленска з Рыгай і Лівонскім ордэнам, першы з якіх адносіцца да 1229 г.

У Вялікім княстве Літоўскім віды заканадаўчых дакументаў сталі больш разнастайнымі. Гэта і Судзебнік (кодэкс права) Казіміра IV 1468 г., і ўстаўныя граматы, прывілеі вялікіх князёў літоўскіх і рашэнні соймаў, зацверджаныя вярхоўнай уладай. На высокім еўрапейскім узроўні састаўлены Статуты 1529 г., 1566 г., 1588 г. — звод законаў феадальнага права ў дзяржаве. З 1588 г., пасля прыняцця апошняга Статута ВКЛ і да канца існавання Вялікага княства Літоўскага,

далейшае развіццё заканадаўства ажыццяўлялася ў асноўным вольнымі соймамі Рэчы Паспалітай і адпаведнымі канстытуцыямі.

Важнейшай крыніцай па гісторыі сярэдневяковай Беларусі з'яўляюцца нарратыўныя (літаратурныя) помнікі. У жанравых адносінах у той час пераважалі рукапісныя помнікі царкоўна-рэлігійнай літаратуры: агіяграфічныя, палемічныя, дыдактычныя, паломніцкія творы. Найбольш яркімі творамі агіаграфічнай (жыційнай) літаратуры



з'яўляюцца: «Сказание о Борисе и Глебе», «Житие Святого нашего отца Кирилла, епископа Туровского». Для гэтай групы крыніц характэрна наяўнасць вялікай колькасці выдуманых фактаў, асобая ўвага галоўным чынам унутранаму свету героя, аднак яны даволі поўна характарызуюць эпоху. Найбольш раннім помнікам царкоўнай палемікі і дыдактыкі з'яўляецца «Слово о законе Моисеевом, данным ему, и о благодати» мітрапаліта Іларыёна, першага рускага прадстаўніка царквы. У некаторых помніках старажытнарускай літаратуры і пісьменнасці ёсць фрагментарные звесткі, што дазваляюць у пэўнай ступені меркаваць аб жыцці, векавых звычаях, рэлігійных вераваннях, матэрыяльнай і духоўнай культуры насельніцтва Беларусі. Бясспрэчным майстрам царкоўнай публіцыстыкі быў епіскап Турава Кірыл. Яго «павучэнні» — яркае сведчанне таму, як нялёгка прыжывалася хрысціянства на ўсходнеславянскіх землях. Найбольш цікавым помнікам паломніцкай літаратуры з'яўляецца «Житие и хождении Даниила, русские земли игумена», у якім адлюстравалася ўспрыманне рускім чалавекам знешняга міра.

У свецкіх літаратурных творах таго часу: «Слово о полку Игореве», «Слово о погибели земли Русской», «Память и похвала князя Владимира» Иакова Мниха, «Повесть об ослеплении Василька Теребовльского», «Повучоние Владимира Мономаха» адлюстроўваецца барацьба з набегамі іншапляменнікаў, апісваецца гісторыя Полацкага і іншых княстваў, якія ўзніклі на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Каштоўнасць гэтых крыніц у тым, што яны дазваляюць нам у думках перанесціся ў мір сярэдневяковай Беларусі, наблізіцца да разумення ментальнасці нашых продкаў. Развіццё духоўнай культуры Беларусі паскорылася ў канцы XV—XVI ст. у сувязі з агульнай эвалюцыяй сацыяльных, палітычных і культурных адносін у ВКЛ.

У Вялікім княстве Літоўскім свецкая літаратура ўзнялася на новы ўзровень. Выдатны беларускі мысліцель, гуманіст, асветнік, першадрукар Ф. Скарына выдаў у Празе ў 1517—1519 г. 20 кніг Бібліі, некалькі кніг былі таксама выдадзены ў сталіцы Вялікага княства Літоўскага — Вільні. У шматлікіх прадмовах Ф. Скарыны выразна праявіліся яго рэнесансна-гуманістычны погляд, патрыятычныя пачуцці і дэмакратызм. У дзейнасці і творчасці Скарыны найбольш поўна ўвасобіліся характэрныя рысы этнічнай і патрыя-



тычнай самасвядомасці беларусаў на завяршаючым этапе фарміравання беларускай народнасці. Рэнесансна-гуманістычныя і патрыятычныя ідэі Ф. Скарыны былі паглыблены яго паслядоўнікамі: С. Будным, М. Гусоўскім, В. Цяпінскім.

Некаторыя дадзеныя па гісторыі Беларусі XVI—XVII ст. можна выбраць з гісторыка-мемуарных помнікаў: дзённікаў, дыярыўшаў соймаў. У гэтых матэрыялах знайшла адлюстраванне ўзросшая сацыяльная кансалідацыя беларускай і літоўской шляхты, «фарміраванне палітычнага народу шляхты». Этнічная, этнакультурная ментальнасць прадстаўнікоў шляхты ВКЛ сярэдзіны XVI ст. прасочваецца ў публіцыстычных сачыненнях Міхалона Ліцьвіна, Андрэя Волана і інш.

Комплекс пісьмовых крыніц па тэме нашай работы значна дапаўняюць старадрукаваныя выданні. У XVI — першай палове XVII ст. на тэрыторыі ВКЛ дзейнічала звыш 15 тыпаграфій, якія выдалі вялізную колькасць кніг самага рознага зместу. У кантэксце нашай тэмы асабліва цікавыя палемічныя і публіцыстычныя творы, прысвечаныя праблемам царкоўна-рэлігійнай уніі, каталіцкай экспансіі, духоўнага жыцця ВКЛ. Кірылічныя выданні ў сваёй большасці ўлічаны ў рабоце «Кніга Беларусі: 1517—1917». Выданні, надрукаваныя лацінскімі шрыфтамі, зарэгістраваны ў шматтомнай бібліяграфіі К. Экстрэйхера.